з амаль аналагічнай семантыкай у свой склад уключае ўжо не кампанент *галава*, а саматызм *рука*: рукі <па локці> ў крыві [3, с. 468] са значэннем ‘хто-н. забіваў людзей, замешаны ў забойстве, пакаранні смерцю’.

Адзначым, што вобразы фразеалагічных адзінак з кампанентам *галава* таксама апісваюць фізічны і псіхічны стан чалавека – *галава ходырам (ходам) ходзіці* [2, с. 283] 1) ‘хто-н. адчувае галавакружэнне (ад стомленасці, паўнаты перажыванняў і пад)’ і 2) ‘хто-н. траціць здольнасць цвяроза разважаць (ад мноства клопатаў, думак і пад.)’. У той час як фразеалагічная адзінка англійскай мовы – *one's head in buzzing* [6] са значэннем ‘галава забіта думкамі’ і *lose one's head* [6] ‘быць азадачаным альбо памешаным, губляць галаву’ апісваюць толькі псіхічны стан чалавека і з’яўляюцца адназначнымі, без дадатковага значэння, якое б апісвала фізічны стан асобы.

Толькі параўнанне асобных фразеалагізмаў дзвюх моў, беларускай і англійскай, паказвае агульнае і адметнае. Пры гэтым такое параўнанне, па-першае, спрыяе іх лепшаму засваенню, вызначэнню асаблівасцей структуры, кампанентнага складу; па-другое, пашырэнню ведаў і выпрацоўкі навыкаў і ўменняў ужываць гэтыя адзінкі дакладна, да месца ў кожнай з дзвюх моў; па-трэцяе, вызначаць падабенства і адрозненне ў светапоглядах двух народаў, спазнаваць культурныя каштоўнасці, уласцівыя ўсім ці толькі аднаму, і інш.

**Літаратура**

1 Гудков, Д. Б. Телесный код русской культуры : материалы к словарю / Д. Б. Гудков, М. Л. Ковшова. – М. : Гносиз, 2007. – 288 с.

2 Лепешаў, І. Я. Слоўнік фразеалагізмаў : у 2 т. / І. Я. Лепешаў. – Мінск : Беларус. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – Т. 1 : А–Л. – 672 с.

3 Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы : у 2 т. / І. Я.Лепешаў. – Мінск : БелЭн, 2008. – Т. 2 : М–Я. – 968 с.

4 Ляшчынская, В. А. Ідыяматыка беларускай мовы ў лінгвакультуралагічым асвятленні : вучэб. дапам. / В. А. Ляшчынская. – Мінск : РІВШ, 2019. – 250 с.

5 Кунин, А. В. Курс фразеологии современного английского языка : учеб. для ин-тов и фак. иностр. яз. – 2-е изд., перераб. / А. В. Кунин – М. : Высш. шк., Дубна: Изд. центр «Феникс», 1996 – 381 с.

6 Cambridge English dictionari – URL: https://dictionary.cambridge.org/dictionary/english/ (дата звароту: 09.04.2025).

**УДК 7.046.1**

***А. А. Нарук***

# НАЦЫЯНАЛЬНЫ МІФ: ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ

*У артыкуле разглядаецца спецыфіка міфа і нацыянальнага міфа ў літаратурным працэсе. Актуальнасць тэмы абумоўлена тым, што міфалогія складае падмурак сучаснай культуры, мастацтва і навукі. Мэта даследавання – інтэрпрэтаваць міф як форму грамадскай свядомасці і разгледзець яго трансфармацыю ў гістарычным працэсе. У выніку разгляд структуры і функцый міфа прыводзіць да прызнання яго неад'емнай рэаліяй культуры, важным фактарам у працэсе кансалідацыі грамадства і фарміравання нацыянальнай свядомасці.*

У сучаснай навуцы існуе вялікая колькасць азначэнняў паняцця міф. Напрыклад, даследчык Я. Касцюхін падае наступную фармулёўку: “Міф – сітэма архаічных уяўленняў пра навакольны свет, выражаных у канкрэтна-пачуццёвай форме; апавяданні, якія ўвасобілі

гэтыя ўяўленні” [1, с. 7]. Паводле Т. Шамякінай, “міф – з’ява сінтэтычная. У ім своеасабліва, адмыслова злучыліся элементы сапраўдных ведаў аб прыродзе, мастацкія вобразы, маральныя нормы і рэлігійныя ўяўленні. Міф – сінтэз філасофіі, рэлігіі ды мастацтва” [2, с. 50].

Нягледзячы на адрозненне дэфініцый, у іх аснове ляжыць прынцып супрацьпастаўлення ratio (розуму) і sensus (пачуцця). Важна, што гэтыя складнікі не ўзаемавыключаюць адзін аднаго: яны існуюць на кантрасце, паралельна; часам ствараюць арганічны сінтэз, калі ірацыянальны, пачуццёвы пачатак набывае такую шырокую ступень абагульнення, што пачынае ўспрымацца як рэалія і не патрабуе лагічнага тлумачэння. І ў такім выпадку фактар праўдападобнасці становіцца перашкодай на шляху стварэння міфа і папросту апускаецца.

Міф – з’ява сінтэтычная, утрымлівае ў сабе разнастайныя складнікі. Яго характэрныя рысы: непадзельнасць вобраза і значэння, імкненне да персаніфікацыі аб’ектаў нежывой прыроды, зварот да мінулага (сакралізацыя “залатога веку”), метафарызм, сімвалізм, гарманічны ў філасофскім і эстэтычным плане падыход да разумення свету.

Існуюць розныя катэгорыі міфаў: этыялагічныя, касмаганічныя, эсхаталагічныя, антрапаганічныя, татэмістычныя, этнагенічныя і інш. Яны падзяляюцца на дзве групы: фальклорнага і літаратурнага (мастацкага) паходжання.

Часам літаратурны міф можа афармляцца ў нацыянальны. У такім выпадку відазмяняецца яго функцыянальнае значэнне з прыватных ідэйна-мастацкіх патрэб аўтара да вышэйшай ступені абагульнення гэтага зместу: “Гэты міф служыць для самаідэнтыфікацыі нацыі, таму найбольш развіваецца і акрэсліваецца ў перыяды нацыянальнага адраджэння” [3, с. 12]. Іншымі словамі, нацыянальны міф – гэта наратыў пра мінулае народа, які развіваецца непаслядоўна, “скачкамі” падчас пэўных сацыяльна-гістарычных зрухаў, што прыводзяць да ўздыму нацыянальнай свядомасці; яго аснову складае ідэалізацыя і паэтызацыя гісторыі, акрэслены падзел на “залаты век” і часы заняпаду; засяроджвае ўвагу як на станоўчых, так і на адмоўных рэаліях, што прыводзіць да ўтварэння стэрэатыпаў.

У структуру нацыянальнага міфа ўваходзяць наступныя складнікі:

1 Нацыянальная ментальнасць – “глыбінная калектыўная ды індывідуальная свядомасць, спалучаная з падсвядомасцю. Гэта ўся тая сукупнасць псіхалагічных установак і арыенціраў, якія «знутры» вымушаюць чалавека ці сацыяльную групу пэўным чынам дзейнічаць, думаць, адчуваць і ўспрымаць свет” [4, с. 54]. Гэты фактар – “першаэлемент”, штуршок да міфатворчага працэсу.

2 Архетыпы – вобразы, сюжэты, матывы, якія часта паўтараюцца ў фальклорных і літаратурных творах; “скразныя мадэлі”, прамое адлюстраванне духоўных каштоўнасцей, маральных норм нацыі.

3 Міфалагемы – міфалагічныя ўніверсальныя вобразы і сюжэты, характэрныя для ўсіх народаў свету; шляхам пераствярэння рознымі нацыямі набываюць прыватныя этнічныя адметнасці.

4 Стэрэатыпы – ацэнка чалавекам пэўных з’яў, рэалій жыцця пад уплывам грамадскай думкі, культурнага, навуковага ці літаратурнага клішэ.

5 Ідэалагемы – асноўныя думкі, што найбольш поўна перадаюць змест грамадска-палітычнай сістэмы поглядаў.

6 Катэгорыі топасу (абмежаванасць прасторы, акрэсленасць месца дзеяння) і часу (калі адбываецца дзеянне, галоўная роля адводзіцца рэтраспекцыі).

Вылучаюць нацыянальны міф знешняга, фальклорнага і літаратурнага паходжання. Апошні на сучасным этапе развіцця з’яўляецца найбольш прадуктыўным. Трэба сказаць, што беларускі нацыянальны міф – досыць маладое ўтварэнне. Ён пачаў афармляцца толькі на пачатку XX ст. у эпоху т. зв. “нашаніўскага” перыяду.

Праўда, зерне тых ідэй было кінута на глебу нацыянальнага адраджэння яшчэ рукою філаматаў і філарэтаў. Інтэлігенты, прадстаўнікі дробнай, часта збяднелай шляхты былі прыхільнікамі “лакальнага” або “краёвага” патрыятызму. Сваёй радзімай яны лічылі ў вузкім сэнсе мясцовасць, дзе нарадзіліся і выраслі, у шырокім – Вялікае Княства Літоўскае.

Нягледзячы на тое, што філаматы і філарэты апелявалі ў сваіх твораў да нацыянальнай культуры, героі і сюжэты іх твораў запазычаны з беларускага фальклору ці гісторыі, а месца дзеяння – этнічныя межы Беларусі, іх канцэпцыю нельга назваць уласна беларускім нацыянальным міфам. Яны так і не змаглі перасягнуць ідэі "краёвасці" і адраджэння Літвы ў межах канфедэрацыі з Польшчай. Праз паэтызацыю і гераізацыю гістарычнага мінулага Беларусі, яе даўнейшых традыцый, культуры і побыту (прычым увага аўтараў скіравана на жыццё эліты грамадства – інтэлігенцыю і шляхту) філаматы і філарэты сталі пачынальнікамі рамантычнага кірунку ў нацыянальнай міфатворчасці.

З часам змяніўся цэнтральны вобраз міфатворчасці: з шляхціца на селяніна, "мужыка". А разам з тым і рэаліі, што яго атачаюць, увага аўтараў завастраецца на побыце вёскі, сельскай гаспадарцы, паншчыне і падатках, рэкрутчыне. Так пастунова адбываўся пераход да рэалістычнага, "жалобнага" кірунку ў міфатворчасці. Гэты падыход падхопіць Францішак Багушэвіч ("Кепска будзе!", "Дудка беларуская"), а затым і цэлае пакаленне "нашаніўцаў".

Афармленне і росквіт уласна беларускага нацыянальнага міфа ў тым выглядзе, якім мы яго звыклі ўспрымаць, прыпадае на пачатак XX ст. У аснове гэтага міфа не проста народ з самабытнай культурай, мовай і гісторыяй, а маладая незалежная дзяржава, жыхары якой называюць і ўсведамляюць сябе беларусамі, а сваю Радзіму – Беларуссю.

Нацыянальная міфатворчасць "нашаніўскага перыяду" прадстаўлена двума кірункамі: рамантычным і "жалобным". Паводле Людмілы Рублеўскай, "«рамантычны» кірунак у стварэнні беларускага міфа звязаны з арыентацыяй на «паўтарыцельны курс» і абвостраным пачуццём нацыянальнай годнасці, «жалобны» кірунак – з моцным фальклорным пачаткам і схільнасцю да антыэстэтычнага паказу жыцця нізоў грамадства" [3, с. 17].

На пачатку дзейнасці "Нашай нівы" дамінавала другая канцэпцыя нацыянальнага міфа. Першапачаткова газета ўзнікла як філіял БСГ і адпаведна арыентавалася на ідэалогію сацыялізму. Цэнтральныя вобразы – беларус-селянін (мужык), яго хата, зямля, вёска. Характэрны сумны настрой, які месцамі пераходзіць у роспач, матыў няспыннай і знясільваючай працы, што часта не прыносіць не толькі грашовага, але і натуральнага прыбытку. Скразны матыў – безвыходнасці, галечы і бяды, востра стаіць праблема зямлі і волі.

"Жалобны" кірунак у міфатворчасці – вынік узаемадзеяння дзвюх тэндэнцый: народніцтва і правінцыяльнага сентыменталізму. Для яго характэрна шчыльная сувязь з фальклорам, традыцыямі народнай песеннай творчасці. Як правіла, сустракаюцца вобразы з ніжэйшай міфалогіі, персаніфікуюцца прыродныя стыхіі:

Пойдзе гульня у іх мёдам салодзенькім,
Развесяляцца, чары завесяць;
Вецер, лясун, русалка з вадзянікам,
Пушча, крыніца, ночка і месяц [5, с. 126].

Неад'емную частку такіх міфаў складаюць прымхі. Згодна з гэтымі ўяўленнямі, чалавек не меў улады над уласным лёсам, бо за яго ўсё прадвызначылі звышнатуральныя сілы. А змаганне з наканаваным часта прыводзіць да непажаданых наступстваў. Цэнтральным вобразам твораў "жалобнага" кірунку з'яўляецца селянін, і яго жыццё непасрэдна залежала ад прыродных стыхій, на якія той не меў магчымасці паўплываць. Часта сустракаюцца персаніфікаваныя вобразы долі, голаду, пошасці, хваробы, смерці. Такія ўвасабленні сустракаем у драматычнай паэме Янкі Купалы "Адвечная песня", дзе яны выступаюць як паўнавартасныя дзейныя асобы, што кіруюць жыццём галоўнага героя – Мужыка.

Сувязь з фальклорам працягнуў і рамантычны кірунак. Але тут міфалагічныя вобразы паўстаюць хутчэй як антуражны фон для стварэння містычнага эфекту.

Матыў моцнай і незалежнай асобы з індывідуальнага героя перакінуўся на тыпізаваны вобраз – народа як актыўнай і дзейнай супольнасці. Грамадства ўжо не ўяўляецца бязвольнай і пасіўнай шэрай масай, якой кіруе нябачная рука наканаванасці, яно само стварае ўласныя законы, якія палічыць справядлівымі. Лейтматывам праходзяць заклікі да дзяржаўнага і культурнага будаўніцтва, сцвярджаюцца ідэі рэфармавання грамадскага ладу, свабода ва ўсіх яе праявах – найвышэйшая каштоўнасць.

Вядучае месца ў гэтым працэсе замацоўваецца за інтэлігенцыяй. У творах усё часцей фігуруюць вобразы паэта (“Курган” Я. Купалы, “Сымон-музыка” Я. Коласа), настаўніка (“Тутэйшыя” Я. Купалы, “На ростанях” Я. Коласа), інтэлігента ў першым пакаленні (“Роднае карэнне” М. Гарэцкага). Такая пераарыентацыя цэнтральных вобразаў – з селяніна на інтэлігента – стала важным этапам у міфатворчасці: нацыя вярнула сваю эліту.

Змена ўстаноўкі з пасіву на актыў засведчыла непрыдатнасць і нежыццяздольнасць “жалобнага” кірунку ў міфатворчасці, і з часам ён саступіў месца рамантычнаму. Апошні атрымаў новы этап развіцця ў межах творчасці Ул. Караткевіча. Рамантычны кірунак у міфатворчасці на сучасным этапе актыўна распрацоўваюць Л. Рублеўская, А. Длатоўская, М. Латышкевіч і інш.

Панаванне ў сучаснай культуры постмадэрну задае вектар развіцця нацыянальнай міфалогіі: некаторыя канцэпцыі прызнаюцца неактуальнымі, а на іх месца прыходзяць іншыя. Хуткімі тэмпамі з’яўляюцца ўсё новыя тэндэнцыі і падыходы, якія, нягледзячы на наватарства, непарыўна звязаны з традыцыяй, прама ці ўскосна арыентуюцца на яе каноны, запазычваюць вобразы і матывы.

Такім чынам, можна гаварыць пра невыкараняльнасць міфа як формы грамадскай свядомасці і яго трансфармацыю ў гістарычным працэсе. Характэрная рыса сучаснай культуры – міфалагічны кантэкст, што фарміруе рэальнасць, з’яўляецца адмысловай прызмай, праз якую чалавек бачыць свет пад пэўным вуглом. І нацыянальная міфатворчасць на сучасным этапе развіваецца ў арганічным сінтэзе наватарства і традыцыі, індывідуальга і тыповага.

**Літаратура**


1 Казакова, І. В. Славянская міфалогія: электронны вучэбна-метадычны комплекс / І. В. Казакова. – Мінск : БДУ, 2020. – 76 с.

2 Шамякіна, Т. І. Міфалогія і яе значэнне / Т. І. Шамякіна // Роднае слова. – 1993. – № 7. – С. 31–26.

3 Рублеўская, Л. І. Партрэт нацыі. Аспекты нацыянальнага міфа ў беларускай паэзіі 10–20-х гадоў ХХ стагоддзя / Л. І. Рублеўская // Роднае слова. – 1995. – № 8. – С. 12–20.

4 Века, А. Усё лятуць і лятуць тыя коні… : артыкул / А. Века // Роднае слова. – 1993. – № 7. – С. 51–56.

5 Купала, Я. Вершы: / уклад. А. А. Сляпцова. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1988. – 270 с.



**УДК 821.161.3-31**



***В. Ю. Плешавеня***


## МІФАЛАГІЧНЫЯ І ФАЛЬКЛОРНЫЯ МАТЫВЫ Ў АПОВЕСЦІ ЛЮДМІЛЫ РУБЛЕЎСКАЙ “НОЧЫ НА ПЛЯБАНСКІХ МЛЫНАХ”


*Артыкул прысвечаны аналізу міфалагічных і фальклорных матываў у аповесці Л. Рублеўскай “Ночы на Плябанскіх млынах”, якія раскрываюць культурную і гістарычную спадчыну Мінска. Даследуецца ўзаемадзеянне герояў з мясцовымі міфамі і легендамі, што дазваляе выявіць іх унутраныя канфлікты. Падкрэсліваецца значнасць твора для беларускай літаратуры і яго ўклад у захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці праз прызму міфалогіі і фальклору.*